ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Настаўніцкая газета
11 лістапада 2010 года

***У пачатку лістапада пачалася прыёмная кампанія на завочных аддзяленнях вышэйшых навучальных устаноў сельскагаспадарчага профілю. І хоць прыём дакументаў завершыцца толькі 30 лістапада, на некаторыя спецыяльнасці ўжо існуе конкурс, што сведчыць пра папулярнасць і запатрабаванасць такой адукацыі ў нашай краіне. Пра ход і адметнасці прыёму на завочныя аддзяленні вядучых аграрных ВНУ краіны нашаму карэспандэнту расказалі адказныя сакратары прыёмных камісій.***

# Попыт расце, абітурыенты маладзеюць

## *Пачалася ўступная кампанія на завочную форму навучання ў сельскагаспадарчыя ВНУ краіны*


В.Б. Лоўкіс.

**Віктар Баляслававіч Лоўкіс, дэкан аграмеханічнага факультэта, адказны сакратар прыёмнай камісіі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта:**

— Абітурыенты завочнага аддзялення нашай навучальнай установы самыя розныя. Гэта і вопытныя работнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, і школьнікі, якія не змаглі паступіць у час летняй прыёмнай кампаніі на стацыянар і ўжо ўладкаваліся на работу. У асноўным наш кантынгент — гэта выпускнікі каледжаў. На гэты момант не ўсе яшчэ дабраліся да прыёмнай камісіі, бо абараняюцца на выпускных экзаменах, але практычна палову кантрольных лічбаў мы ўжо маем.

Кантрольныя лічбы прыёму засталіся фактычна тымі ж. Адзінае — адкрыўся філіял на базе Буда-Кашалёўскага аграрна-тэхнічнага каледжа, куды набіраюцца 50 чалавек. У выніку на платнае навучанне па завочнай форме ва ўніверсітэт будзе прынята на 50 чалавек больш, чым у мінулым годзе. На бюджэтнай аснове будуць вучыцца 130 чалавек, а на платнай — 800.

Як і ва ўсіх вышэйшых навучальных установах, для паступлення на завочнае аддзяленне трэба або прадставіць сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання, або здаць уступныя экзамены. І значная колькасць абітурыентаў заяўляюць сертыфікаты ЦТ. Дарэчы, у абітурыента ёсць выбар: ён можа падаць адзін, два або тры сертыфікаты ці здаць уступны экзамен.

Уступныя экзамены ў нашым універсітэце праводзяцца ў пісьмовай форме і падобны да тэстаў. Канечне, яны не такія, як на цэнтралізаваным тэсціраванні (у іх менш заданняў), але максімальна да іх набліжаны. Заданні складаюцца на аснове праграмы ўступных экзаменаў, зацверджанай Міністэрствам адукацыі. Класічны ж універсітэцкі экзамен па профілі абітурыенты здаюць, калі паступаюць на скарочаны тэрмін навучання. У іх уступнай кампаніі нічога не змянілася.

Пра агульны конкурс, канечне, гаварыць яшчэ рана, але, напрыклад, на спецыяльнасць “Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве” кантрольныя лічбы практычна выкананы. У мінулым годзе ў нас увогуле быў вялікі конкурс — больш за 4 чалавекі на месца, што на дзённым аддзяленні проста неймаверна. А калі браць бюджэт, то там даходзіла да 30 чалавек на месца! Традыцыйна папулярнымі з’яўляюцца спецыяльнасці, звязаныя з тэхнічным і энергетычным забеспячэннем вытворчасці, а таксама ўсё тая ж “Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве”. Пакуль абітурыенты лічаць, што эканамічная спецыяльнасць самая важная і запатрабаваная ў нашай краіне. На інжынерныя спецыяльнасці конкурс не такі высокі. І гэта тлумачыцца тым, што вучыцца на інжынера не вельмі проста. Тым не менш назіраецца тэндэнцыя павышэння цікавасці да гэтай спецыяльнасці.

Апошнім часам назіраецца вялікі попыт на завочную адукацыю. На прадпрыемствах усё часцей работадаўцы патрабуюць павышэння кваліфікацыі сваіх супрацоўнікаў, а некаторыя нават ажыццяўляюць аплату завочнага навучання.

Каб падрыхтавацца да ўступных экзаменаў, у нас ёсць шэраг курсаў. Яны ўсе розныя (адрозніваюцца па часе правядзення (дзённыя, вячэрнія), тэрмінах (ад некалькіх тыдняў да некалькіх месяцаў). Тыя, хто адвучыцца на такіх курсах, асаблівых бонусаў не маюць, але калі, напрыклад, узнікне сітуацыя роўнасці балаў, то перавага можа быць аддадзена таму абітурыенту, які закончыў нашы курсы. Але, безумоўна, у першую чаргу ацэньваюцца веды.

**Сяргей Юр’евіч Собалеў, кандыдат сельскагаспадарчых навук, адказны сакратар прыёмнай камісіі Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта:**

— Нашы абітурыенты — гэта ў асноўным людзі працуючыя, хаця ёсць і ўчарашнія школьнікі. Практычна ва ўсіх за плячамі каледжы і вучылішчы, якія яны закончылі 2—5 гадоў назад. Разам з тым сустракаюцца і такія, хто заканчваў навучальныя ўстановы 10 і нават 20 гадоў назад. Тым не менш усе яны маюць працоўны стаж, працуюць у сельскагаспадарчай галіне, у прыватнасці ў аграноміі, заатэхніі.

На скарочаную форму навучання паступаюць абітурыенты, якія ўжо маюць спецыяльную адукацыю ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Сярод гэтай катэгорыі абітурыентаў таксама шмат тых, хто па сваім профілі (эканамісты, бухгалтары) працуе менавіта ў сельскай гаспадарцы.

На завочнае аддзяленне мы набіраем 145 чалавек на бюджэтныя месцы і 930 — на платныя. І прапаноўваем 14 спецыяльнасцей і спецыялізацый. Традыцыйна высокі конкурс на эканамічныя (напрыклад,“Эканоміка, бухгалтарскі ўлік”) спецыяльнасці. У завочным навучанні не існуе мэтавага прыёму, але сустракаюцца выпадкі, калі навучанне студэнту-завочніку аплачвае зацікаўленая ў спецыялісце арганізацыя.

Сёлета ўпершыню на завочнае аддзяленне мы пачалі прымаць дакументы па спецыяльнасці “Тэхналогія, захаванне і перапрацоўка харчова-расліннай сыравіны” і “Перапрацоўка жывёльнай сыравіны”. У кожнай з гэтых новых спецыяльнасцей ёсць па дзве спецыялізацыі. Па раслінным напрамку — “Захаванне і перапрацоўка зерня” і “Тэхналогія хлебапякарнай, макароннай і кандытарскай вытворчасці і харчканцэнтратаў”. А па напрамку жывёлагадоўлі — “Тэхналогія мяса і мясных прадуктаў” і “Тэхналогія малака і малочных прадуктаў”. На гэтых спецыяльнасцях будуць вучыцца будучыя інжынеры-тэхнолагі.

Каб паступіць на завочнае аддзяленне, трэба здаць экзамены або прадставіць сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання. У нас ёсць абітурыенты, якія здаюць экзамены, і ёсць тыя, хто прад’яўляе сертыфікаты. Звычайна падаюць сертыфікаты з сярэднім балам 20, але калі на спецыяльнасць высокі конкурс, а ў сертыфікатах невысокія балы, то абітурыенты здаюць уступныя экзамены. На біялагічныя спецыяльнасці здаецца біялогія і хімія, на эканамічныя — матэматыка і замежная мова, будучыя тэхнолагі здаюць хімію і матэматыку. Зразумела, дыктант пішуць (або прад’яўляюць сертыфікаты) на ўсіх спецыяльнасцях. Абітурыенты, якія паступаюць на скарочаны тэрмін навучання, здаюць профільныя прадметы. Напрыклад, аграномы здаюць “Раслінаводства” і “Земляробства”. Трэба адзначыць, што на спецыяльнасці скарочанага навучання ў нас вялікія конкурсы. Менш чым 2 чалавекі на месца не бывае.


А.А. Паддубны.

**Алег Андрэевіч Паддубны, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт кафедры глебазнаўства, адказны сакратар прыёмнай камісіі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі:**

— Сярод нашых абітурыентаў большасць — гэта ўсё ж працуючыя, якія жадаюць атрымаць вышэйшую адукацыю без адрыву ад вытворчасці. Хаця, канечне, ёсць і ўчарашнія выпускнікі сярэдніх школ, якія не змаглі паступіць на стацыянар. Па апошніх звестках (вечар аўторка, 9 лістапада), 60 чалавек падалі дакументы з трыма сертыфікатамі. Акрамя таго, у апошнія гады назіраецца тэндэнцыя амаладжэння завочнікаў.

На бюджэт мы набіраем 405 чалавек, на платнае навучанне — 1003 чалавекі. Але гэта без уліку філіялаў. У пінскім філіяле набіраецца 120 чалавек на платнае аддзяленне, у палескім (Калінкавічы) — 110 чалавек таксама на аснове аплаты. Акрамя таго, у нас ёсць Вышэйшая школа аграбізнесу, дзе можна атрымаць другую вышэйшую адукацыю. Сюды набіраем 180 чалавек на платнае навучанне.

Пакуль пра конкурс гаварыць ранавата, але, зыходзячы з вынікаў уступнай кампаніі мінулага года, найбольшай папулярнасцю карысталіся інжынерныя спецыяльнасці. Быў конкурс на спецыяльнасці па бухгалтарскім уліку і традыцыйна на правазнаўства. Мінімальны конкурс складаў 1,3 чалавека на месца, а максімальны — каля 10 чалавек на месца. Сёння завочнае навучанне стала даволі папулярным.

Зразумела, каб паступіць на завочнае аддзяленне, трэба здаць уступныя экзамены, якія ў нашай навучальнай установе праводзяцца ў форме класічных пісьмовых экзаменаў. Вусных экзаменаў у нас няма. Гэта зроблена для таго, каб пазбегнуць прадузятасці. А тыя, хто падаў сертыфікаты, ацэньваюцца па балах, атрыманых на цэнтралізаваным тэсціраванні.

Для тых, хто жадае падцягнуць свае веды, у нас ёсць разнапрофільныя і featureзнатэрміновыя падрыхтоўчыя курсы. Напрыклад, у мінулым годзе на такіх курсах вучыліся 190 абітурыентаў завочнага аддзялення. Усе курсы платныя, там працуюць вопытныя выкладчыкі, якія дапамагаюць успомніць і замацаваць школьную праграму. Канечне, гэта ў першую чаргу неабходна тым, хто закончыў школу даўно.

Пакуль прыёмная камісія працуе ў штатным рэжыме. На вечар 9 лістапада пададзена больш за 200 заяў на бюджэтныя месцы і 175 на платныя. Мяркую, што выйдзем на ўзровень мінулага года. У мінулым годзе была пададзена 3331 заява, а патрэбна было 1353 чалавекі.

**Дзмітрый Гулькові́ч, выпускнік Пружанскага аграрна-тэхнічнага каледжа**, ужо стаў абітурыентам Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта. Юнак выбраў спецыяльнасць “Механізацыя”. Цяпер ён працуе інжынерам-механікам у ПМК-29 Пружан. Па меркаванні Дзмітрыя, сёння вышэйшая адукацыя ў сельскай гаспадарцы вельмі запатрабаваная. Каб стаць студэнтам-завочнікам БДАТУ, Дзмітрый летам здаў цэнтралізаванае тэсціраванне па фізіцы, матэматыцы, рускай мове. Акрамя таго, старанна вучыўся ў каледжы (сярэдні бал яго дыплома — 8,2).


Д. Гулькові́ч.

**Запісала Вольга БАРЫСЕВІЧ.**